ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

№ 146 | СУБОТА 27 ЧЭРВЕНЯ | (1416)

„Толькі тады, калі краіна будзе электрыфікавана, калі пад прамысловасьць, сельскую гаспадарку і транспорт будзе падведзена тэхнічная база сучаснай буйнай прамысловасьці, толькі тады мы пераможам канчаткова“ (Ул. І. Ленін).

СКЛАДАЙЦЕ ЧАРЦЯЖЫ МУРОЎ СОЦЫЯЛІЗМУ

Пэрспэктыўны плян будзе новым, другім пяцігадовым плянам. Ен павінен быць плянам канчатковай перамогі соцыялістычных элемэнтаў у вёсцы, вырашэньня ў асноўным проблемы зьнішчэньня процілегласьці паміж горадам і вёскай і сур'ёзнага зруху ў справе вырашэньня проблемы зьнішчэньня розьніцы паміж фізычнай і разумовай працай.

(Куйбышаў).

Артыкул адказнага сэкратара оргкамітэту па складаньню генэральнага пляну электрыфікацыі БССР т. Чудноўскага.

—Я першы сказаў „э“, Іван Нікіфаравіч. Не, я, Іван Іванавіч. Не, Іван Нікіфаравіч, я сказаў першы „э“. Ды што вы, Іван Іванавіч, я першы сказаў „э“.

Гэтыя вялікія спрэчкі адбываліся не ў маёнтку гогалеўскіх старасьвецкіх абшарнікаў, гэтыя спрэчкі ішлі на апошнім сусьветным энэргетычным конгрэсе аб стварэньні адзінай эўропэйскай энэргогаспадаркі.

Спрачаўся француз з італьянцам.—Мой плян лепшы за шага,—гаварыў француз.—Не, мой, упіраўся італьянец.—Ды чым-жа ваш лепшы? гарачыўся француз—У нас рабочыя больш спакойныя, цэнтр энэргетыкі павінен быць у Італіі.—Ды не! Рабочыя і ў нас сьмірныя і разьмяшчэньне Францыі на матэрыку больш выгаднае,—цэнтр павінен быць ва Францыі.

А вакол сядзелі сусьветныя вучоныя і слухалі. Слухалі, слухалі, на гэтым і разышліся.

Так скончылася апошняя спроба „вялікіх“ дзяржаў дагаварыцца аб пляне адзінага забесьпячэньня Эўропы электрычнай энэргіяй.

Нас дзеляць рубяжы

Энэргетыка—гэта пятля, якая ўсё мацней сьціскае горла капіталістычнай грамады. Тэхніка патрабуе стварэньня магутных энэргетычных вузлоў. Але капіталізм ня можа іх стварыць. Імпэрыялістычныя трэсты заўсёды гатовы накінуцца адзін на аднаго, каб задушыць супраціўніка. Хто-ж з іх адважыцца перадаць у рукі ворага крыніцу жыцьця краіны.

Ангельскі вучоны Гэбэр Блекенорн у „Разьвіцьці электрыфікацыі Вялікабрытаніі“ піша—„У расце Лёндана 77 электростанцый, 65 сетак, два тузіны рознага роду напружаньняў і паўтузіна рознага роду пэрыодаў. Сеті перапл[і]таюцца, але станцыі ня могуць аказаць падтрыманьне адна аднэй на выпадак аварыі“.



У нас шумяць турбіны

А якая „вялікая“ дзяржава згодзіцца сконцэнтраваць крыніцу энэргіі ў адным месцы і паставіць жыцьцё капіталізму ў залежнасьць ад забастоўкі рабочых толькі на адной электростанцыі.

Капіталізм загіне таму, што, тармозячы разьвіцьцё тэхнікі, ён душыць працоўных, таму, што разьвіцьцё вытворчых сіл магчыма толькі пры дыктатуры пролетарыяту.

Прыступаючы да пабудовы соцыялістычнага грамадзтва, мы ў аснову разьвіцьця кладзем стварэньне магутнай энэргетычнай базы на аснове электрыфікацыі. Электрычнасьць нясе ў сабе новую тэхніку, без якое соцыялізм пабудаваць нельга.

Аб гэтым гаварыў Ленін, калі ў 1921 годзе па яго заданьню ствараўся першы генэральны плян разьвіцьця Савецкага Саюзу—ГОЭЛРО—плян пабудовы магутнай, адзінай энэргетычнай гаспадаркі.

На аснове першага пляну ГОЭЛРО мы завершаем пабудову фундамэнту соцыялістычнай грамады. СССР на базе электрыфікацыі выходзіць у шарэнгу перадавых індустрыяльных краін. СССР на аснове электрыфікацыі дасягае такіх тэмпаў разьвіцьця, якіх ня ведае чалавецтва на працягу ўсёй гісторыі свайго разьвіцьця.

У 1937 годзе мы будзем мець 60 мільёнаў тон чыгуна, тады як Амэрыка здабывае толькі 40 млн. тон. Мы будзем мець 150 млн. тон нафты, тады як Амэрыка—толькі 125 мл. тон. К 1937 году мы будзем мець да 50 млн. квт. устаноўленай магутнасьці.

На аснове магутнага росту Савецкага саюзу адбываецца колёсальны ўздым нацыянальна і культурна адсталых раёнаў БССР, якая ня мела раней ніякай энэргетычнай базы, якая ня мела буйной прамысловасьці, зараз, у пэрыод завяршэньня першага пляну ГОЭЛРО, уяўляе сабою краіну са значна разьвітай індустрыяй.

Працоўныя БССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дабіліся такіх вынікаў у выкананьні свайго пяцігадовага пляну:

	28-29 г.	32-33 г.
Капітальныя ўклады		
Па пляну	33968	62193
Фактычна	29384	174589
Прадукцыя		
Па пляну	252082	717009
Фактычна	225076	1314700
Лік рабочых		
Па пляну	38424	88289
Фактычна	39034	100000

Гэты рост адбываецца на базе ствараньня новай энэргетыкі. Калі наша ў 1928 г. БССР мела 16 тыс. квт. устаноўленай магутнасьці, дык к 1932 г. гэта колькасьць вырасла да 60 тыс. квт. К 1937 году БССР будзе мець 500 тыс. квт. устаноўленай магутнасьці. Калі ў 1928 годзе было выпрацавана 48 млн. квт. гадзін, дык у 1932 г. гэта колькасьць вырастае да 150 млн. квт. гадзін.

На такім фундамэнце мы прыступаем зараз да складаньня другога генэральнага пляну, пляну на ўзовы разгорнутага соцыялістычнага грамадзтва.

Другі генэральны плян павінен забясьпечыць паглыбленьне тых працэсаў, пачатак якіх закладзены пляном ГОЭЛРО.

А зараз у асноўных мэтавых установак пабудовы генэральнага пляну зьяўляецца ліквідацыя процілегласьці паміж горадам і вёскай.

Стварэньне буйных механізаваных калгасаў і саўгасаў—фабрык малака, мяса, збожжа, лёну, ліквідацыя дробнай вытворчасьці, якая заснавана на індывідуальнай невялікай працы—гэта першы крок у падыходзе да развіцьця вёскі, гэта аснова ліквідацыі „ідыотызму вясковага жыцьця“, аб якім пісалі ў „Комуністычным маніфэсьце“ Маркс і Энгельс. Гэты процэс ліквідацыі процілегласьці між горадам вёскай павінен быць закончаны з тым, каб к 1942 году ня існавала гораду і вёскі ў старым разуменьні гэтага слова, з тым, каб к 1942 году існавалі соцыялістычныя пасяленьні, адзіная соцыялістычная вытворчасьць.

Электрычны штурм сельскай гаспадаркі

На аснове ўкараненьня электрычнасьці ў перапрацоўку сельска-гаспадарчых продуктаў, на аснове ўкараненьня яе ў апрацоўку зямлі, мы створым новую сельска-гаспадарчую вытворчасьць. Для БССР, якая спэцыялізуецца на вытворчасьці продуктаў тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, гэта значыць магутнае разгортваньне энэргетычнай базы, бо электрычны штурм сельскае гаспадаркі пачнецца менавіта з вытворчасьці тэхнічных культур і жывёлагадоўлі.

Другой установкай генэральнага пляну электрыфікацыі будзе ліквідацыя процілегласьці паміж разумовай і фізычнаю працай. Калі разьвіцьцё тэхнікі ў капіталістычнай грамадзе спадарожваецца ператварэньнем рабочага ў сьляпы прыдатак да машыны, дык ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту электрыфікацыя—аўтоматызацыя, мэханізацыя вытворчасьці вядзе да ператварэньня рабочага ў організатара і кіраўніка, які накіроўвае вытворчы процэс.

Машына працуе за чалавека

Машына здабывае вугаль, машына плавіць мэталь, машына арэ зямлю, а чалавек стаіць у рычагоў, электрычных прыводаў і сочыць за нормальнай работай мэханізму. Сымбаль гэтае новае працы—рабочы сучаснай электростанцыі, які стаіць ля мармуровых шчытоў і накіроўвае ў сотні кілямэтраў энэргію ў мільёны конскіх сіл, які можа выклікаць да жыцьця рух, які можа адным паваротам рукі прымусіць замерці цэлыя прамысловыя раёны.

Ставячы перад сабою задачу максымальна хуткай пабудовы соцыялістычнага грамадзтва, мы павінны памятаць, што, узмацняючы сваю экономічную магутнасьць, праводзячы новую тэхнічную базу пад нашы развіцьцё, мы мацуем абароназдольнасьць краіны.

Задачы пабудовы соцыялістычнага грамадзтва, задача стварэньня соцыялістычных вытворчых адносін на аснове новай тэхнікі, вось што павінна быць рэалізавана намі ў другім пляне ГОЭЛРО.

Усе сілы—на максымальна хуткія тэмпы соцыялістычнай пабудовы. Пад гэтым лёзунгам павінна праходзіць складаньне генэральнага пляну электрыфікацыі. Мы павінны выявіць усе магчымасьці, якія толькі ёсьць у нас, каб выкарыстаць усё жывое і вартае на справу соцыялістычнаму будаўніцтву.

Прымусіць сонца будаваць соцыялізм

Вось лёзунг сёньняшняга дня. Асноўнай наметкі пэрспэктыўнага пляну зьяўляецца выяўленьне ўсіх прыродных і энэргетычных рэсурсаў,



якія могуць быць намі выкарыстаны для пабудовы соцыялістычнага грамадзтва.

Мы ўзьнясем магутныя гідростанцыі, мы прымусім торп круціць гіганты электрычнасьці і цяпла. Навука зараз ставіць задачу выкарыстаць ня толькі гэтыя запасы энэргіі, але і тую энэргію, якую штодзённа пасылае нам на зямлю сонца. Сабраць сонечнае сьвятло праз хэмічныя элемэнты ў акумулятары—вось задача, якую нашы вучоныя ўжо вырашаюць сёньня ў Туркестане. Па падліках акадэміка Іофэ з дахаў аднэй толькі Масквы можна сабраць энэргіі да 20 млн. квт., г. з. магутнасьць у 400 раз большую, чым мае ўся электрогаспадарка БССР на сёньняшні дзень.

Перакінуць электрычную энэргію ад асноўных яе крыніц на тысячы кілёмэтраў, даць электрычную энэргію ва ўсе куткі Савецкага Саюзу,—вось задача, якая стаіць перад надыходзячым дзесяцігодзем. Забясьпечыць прамысловасьць і сельскую гаспадарку, забясьпечыць соцыялістычныя пасяленьні ня толькі энэргіяй але і цяплом, падняць на вышэйшы тэхнічны ўзровень нашу энэрга-гаспадарку—вось задача якую мы будзем вырашаць у бліжэйшае дзесяцігодзе.

У БССР ёсьць поклады жалезнае руды, сапропэляй, гліны, мэргеляй і інш., якія могуць і павінны быць скарыстаны на аснове ўкараненьня электрычнасьці ў вытворчы процэс.

Дняпро будзе рухаць турбіны

Усім вядомы невычэрпныя запасы торпу ў БССР. На гэтай базе павінна быць створана магутная электрыфікацыя і цэлы рад новых галін прамысловасьці. Дняпро нясе ў сабе магутную сілу, якую трэба прымусіць рухаць турбіны гідростанцый. Злучыць праз Дняпро і Дзьвіну Балтыйскае і Чорнае мора, стварыць вялікі Дняпро, які-б змацаваў паўночную мэталюргію з усёй заходняй прамысловасьцю Савецкага Саюзу—вось проблема бліжэйшага дзесяцігодзьдзя.

Ператварыць беларускую сельскую гаспадарку ў гіганцкую фабрыку лёну, канапель і продуктаў жывёлагадоўлі. І ўсё гэта на базе магутнай электрыфікацыі—новай соцыялістычнай тэхнікі.

За ўсё гэта павінен змагацца кожны ўдарнік, рабочы і калгасьнік, кожны комсамолец. Кожны працоўны павінен зразумець, што такое другі генэральны плян электрыфікацыі. Зразумець, прачуць і моцна біцца за хутчэйшыя тэмпы ажыцьцяўленьня геніяльных ідэй Маркса, Энгельса, Леніна, якія праводзяцца ў жыцьцё працоўнымі Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі.



Пражэктарамі сустрэчных шлях наступных

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ЗАДАЧЫ ЛКСМБ

Да 1930 году электрычнасьць для вытворчых мэт у сельскай гаспадарцы па БССР ня ўжывалася. Толькі у 1930 годзе пачата будаўніцтва першай электрасеткі сельскага значэньня у Віцебскім раёне,

Брыгада комсамолак - бэтоншчыц на будаўніцтве ГЭС.

якая зараз абслугоўвае каля 50 проц. саўгасаў і колгасаў раёну.

Курс на карэнную зьмену с.-г. энэргетыкі

У 1931 годзе прыступлена да будаўніцтва электрасеткі ў Аршанскім, Лёзьненскім і Рагачоўскім раёнах, якія ў агульным маюць магутнасьць на 30—35 тысяч кілёват.

Акрамя раённай сеткі, пачата пабудова электрасеткі мясцовага значэньня, якая будзе абслугоўваць збожжавыя саўгасы і МТС. Гэтая электрасетка будуецца у камуне „10-годзьдзе БССР“, на Койданаўскай МТС, у Слуцкім, Мозырскім, Горацкім і Лепельскім раёнах.

Да канца пяцігодкі, па пляну электрыфікацыі сельскай гаспадаркі БССР, намечана ўстанавіць электрасетку ў 59 раёнах. Будаўніцтва гэтай электрасеткі будзе праводзіцца ў Менскім, Барысаўскім Гомельскім, Слуцкім і іншых раёнах БССР.

Пры складаньні новай пяцігодкі ўзяты курс на тое, каб у корані зьмяніць сельска-гаспадарчую энэргетыку: ня менш паловы агульнай патрэбы сельскай гаспадаркі ў энэргіі будзе пакрыта за кошт электрычнай энэргетыкі.

Электраэнэргія—магутны вагар для хуткіх тэмпаў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Трэба шырока выкарыстаць сілы прыроды, як энэргетычныя рэсурсы дзеля узьняцьця продукцыйнасьці працы і механізацыі сельскай гаспадаркі.

З чаго пачынаць работу

Комсамол—шэф электрыфікацыі. Грандыёзны размах работ, які павінен быць узяты ў другой пяцігодцы па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, патрабуе ад усёй вясковай грамадзкасьці і ў першую чаргу ад комсамолу мобілізаваць усе свае сілы і ўвагу на падрыхтоўку да складаньня генэральнага пляну электрыфікацыі.

Падрыхтоўка да складаньня генэральнага павінна ісьці па лініі: разгортваньня краязнаўчай работы і барацьбы за датэрміновае выкананьне пляну будаўніцтва электрасеткі за 1931-32 г.

Краязнаўчая работа комсамольскай організацыі павінна ахапіць: вывучэньне прыроднага багацьця свайго раёну, вывучэньне шляхоў экономічнага разьвіцьця раёну пры электрыфікацыі; вывучэньне адпаведнасьці задачам разьвіцьця высока-продукцыйнай сельскай гаспадаркі таго гаспадарчага напрамку, да якога зараз аднесен раён па спецыялізацыі сельскай гаспадаркі.

Прыцягнуўшы да актыўнай работы навуковыя і культурныя сілы раёну, масы вучнёўства, краязнаўчыя ячэйкі і іншыя грамадзкія організацыі, трэба шырока популярызаваць сярод колгасьнікаў, бедняцкіх і серадняцкіх аднаасобнікаў той гаспадарчы эфэкт, які атрымоўць асобныя вядучыя галіны сельскай гаспадаркі (жывёлагадоўля, тэхнічныя культуры) ад падвядзеньня пад іх электрычнай базы.

Разам з гэтым комсамол павінен актыўна змагацца за датэрміновае выкананьне пляну будаўніцтва сельскай электрасеткі, якая намечана на 1930-31 год.

Зламаць бар'еры перашкод

Выкананьне пляну будаўніцтва электрасеткі сустракаецца з радам цяжкасьцяй і перашкод, якія мянавіта заключаюцца ў тым, што электраэнэргія для вытворчых мэт у сельскай гаспадарцы сёлета ўжываецца толькі ўпяршыню, яе гаспадарчы эфэкт не популярызаваны сярод шырокіх колаў спажыўцоў, няма вопыту ў будаўніцтве сельскай электрасеткі, не хапае адпаведнай кваліфікаванай сілы. Напрыклад, раскіданасьць мантажных брыгад па колгасах і саўгасах не дае магчымасьці адміністрацыйнаму пэрсоналу непасрэдна кіраваць і наглядаць за іх работай. Адсюль пасобныя брыгады нясур'ёзна адносяцца да выкананьня свайго заданьня, выяжаюць тэмпы монтажных работ і якасьць іх. Несвачасова загатаўляецца і дастаўляецца спажыўцамі будаўнічы матар'ял (слупы, цэгла, камяньне). Для прыкладу можна ўзяць Аршанскі РВК, які даставіў на пабудову будаўнічы матар'ял са спазьненьнем на два месяцы. Не хапае каляровых мэталяў, не мобілізуюцца ўнутраныя рэсурсы.

Усё гэта разам узятае параджае сур'ёзныя перашкоды і цяжкасьці для пасьпяховага заканчэньня будаўніцтва сельскай электрасеткі. У Віцебскім раёне будплян за сакавік месяц выканаены толькі на 50 проц., усё з-за таго, што гаспадарчы эфэкт ад электрыфікацыі пасобных галін сельскай гаспадаркі слаба популярызаваны. Вельмі цяжка выявіць спажыўца.

Маршрут на права перамог

Дзеля таго, каб перамагчы гэтыя перашкоды і цяжкасьці, каб забясьпечыць датэрміновае выкананьне пляну пабудовы электрасеткі за 1931—32 год і забясьпечыць пасьпяховую падрыхтоўку да складаньня генэральнага, комсамольскія організацыі ў сваёй штодзённай практычнай дзейнасьці павінны:

Праз шырокае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва складаць сустрэчныя пляны, змагацца за датэрміновае выкананьне будаўнічых плянаў электрыфікацыі, дабівацца справаў ўдарных тэмпаў у пабудове электрасеткі, популярызаваць сярод мас колгасьнікаў, рабочых саўгасаў, аднаасобнікаў беднякоў, серадняком эфэктыўнасьць падвядзеньня энэргетычнай базы і разьвіцьці сельскай гаспадаркі, выявіць і падрыхтаваць спажыўца электраэнэргетыкі (саў-



Акутаем БССР сеткаю магутных электрастанцый

гас, колгас і інш.), весьці рашучую барацьбу з кулацтвам і яго агентурай, якія імкнуцца перашкодзіць пасьпяховай электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Забясьпечыць пабудовы электрасеткі комсамольскімі кадрамі рабочай сілы, абагуліць практыку лепшых узораў работы пасобных брыгад і ўдарнікаў на пабудове, перадаць гэты вопыт на іншыя пабудовы, змагацца за падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў электраманцёраў, лінейшчыкаў і інш. непасрэдна на пабудове.

Дабіцца сваечасовай загатоўкі і вывазкі будаўнічых матар'ялаў спажыўцамі, організоўваць дзеля гэтага спэцыяльныя комсамольскія і маладзёжныя брыгады на дапамогу ў вывазцы і загатоўцы будаўнічых матар'ялаў.

Змагацца за датэрміновае выкананьне монтажных работ, узьняцьце продукцыі і якасьці працы монтажных брыгад. Змагацца за беражлівае і рацыянальнае выкарыстаньне каляровых мэталяў, організаваць ўлату спажыўцоў (колгасы, саўгасы і інш.) на мобілізацыю унутраных рэсурсаў і запасаў каляровых мэталяў.

Усе сілы, усю комсамольскую энэргію—на пасьпяховае выкананьне праграмы будаўніцтва электрасеткі ў 1931-32 годзе, па-ўдарнаму разгорнем краязнаўчую і масавую работу насустрач генэральнаму, забясьпечым масавы ўдзел усёй пролетарскай грамадзкасьці ў яго складаньні.

---

21 проц. усёй плошчы, каля 50 проц. усяе прыгоднае для ворыва зямлі яшчэ пакрыта непраходнаю балотнай тваньню.

Балотная плошча БССР роўна тэрыторыі Бэльгіі.

Балота—біч беларускага насельніцтва.

Балота—багацьце краіны.

Дасьледваньне і асушка балотных плошчаў—проблема разьвіцьця Беларусі.

Культываваньне балотных масываў—гэта сотні тысяч га ўраджайных сельска-гаспадарчых угодзьдзяў, мэліорацыя балот—гэта ізоляцыйныя пліты для будаўніцтва, сыравіна для фабрык і заводаў, паліва для прамысловасьці.

Па прыблізных падліках, балота захоўвае 1.200 мільёнаў тон сухога торпу.

Торп—энэргетыка

Энэргетыка—ключ да ператварэньня аграрнай Беларусі ў індустрыяльна-аграрную.

* * *

Комсамол—шэф электрыфікацыі, а гэта значыць—шэф торпу. Торп і электрыфікацыя—адно ад другога неаддзельна. Разьвіцьцё беларускай энэргетыкі немысьліма без форсаванага разьвіцьця тарпянай прамысловасьці.

Торп—рухавік новых сотень прамысловых прадпрыемстваў, новых дзесяткаў электрычных станцый і фабрычна-заводзкіх устаноў.

Хто гэтага ня ведае, той ня ведае будучага Беларусі.

Хто гэтага сабе не ўяўляе, той дрэнна ўяўляе пэрспэктывы разьвіцьця рэспублікі,



той дрэнна змагаецца за соцыялістычнае ператварэньне Савецкай Беларусі, той будуе соцыялізм з зачыненымі вачыма.

Да апошняга часу з боку цэлага раду комсамольскіх камітэтаў мелася недаацэнка, ігнараваньне, торпу.

Барацьбу за торп райкомы і ячэйкі лічылі другараднай справай. Пытаньні торпу ў самых абшырных абвестках дня комсамольскіх організацый вельмі часта не знаходзілі сабе ня толькі належнага, але наогул якога-небудзь месца.

І нават пасьля спэцыяльнага рашэньня ЦК КП(б)Б і ЦК комсамолу—неабходнага пералому ў гэтай справе не адбылося.

На торпараспрацоўках з месяцу ў месяц—прарывы, невыкананьне прамфінпляну, востры недахоп рабочае сілы, адсутнасьць належнай культмасавай працы. А комсамольскія організацыі на ліквідацыю гэтых прарываў дрэнна, вельмі дрэнна мобілізуюць свае рады.

Больш таго. Па пастанове ЦК ЛКСМБ, райкомы павінны былі мобілізаваць на торпараспрацоўкі 1000 комсамольцаў. У пастанове была ясна паказана ўся важнасьць і неабходнасьць гэтай мобілізацыі. І ўсё-ж знайшліся Клябанавы, якія, замест людзей, пасылалі торпазаводам наступнага зьместу лісты:

„Койданаўскі раён зьяўляецца раёнам буйных саўгасаў і колгасаў. Па заданьню райкому партыі мы павінны мобілізаваць 100 комсамольцаў ў саўгасы нашага раёну, 50 чалавек на заводы і 50 комсамольцаў на курсы ЦІП'у для свайго раёну.

Выходзячы з усяго гэтага, мы людзей для торпапрамысловасьці даць ня можам“.

Сэкратар ЛКСМБ Клябанаў.

Гэты дакумант ва ўсёй паўнаце і нягожасьці ўскрывае політычную блізарукасьць, сьлепату койданаўскага кіраўніка, які не зразумеў да гэтага часу значэньня тарпяной прамысловасьці ва ўмовах БССР.

Падобных фактаў можна было-б прывесьці, дзесятак. Яны сыгналізуюць аб тым, што цэлы рад комсамольскіх організацый не ўяўляе сабе тарпянай проблемы ва ўсёй яе грандыёзнай паўнаце, што торп яшчэ ня стаў складавай, неадлучнай часткаю шэфства комсмаолу над электрыфікацыяй.

У сучасны момант пры ВСНГБ пачаў работу ўсебеларускі камітэт па складаньню генэральнага пляну электрыфікацыі.

* * *

Каб падрыхтаваць неабходныя матар'ялы для генпляну, пры камітэце організавана 7 рабочых груп.

З іх: група па вывучэньню стану энэргазабясьпечаньня беларускай прамысловасьці і пэрспэктыў яе разьвіцьця на базе электрыфікацыі. У задачы гэтай групы ўваходзіць: выявіць патрэбнасьці прамысловасьці ў энэргіі і намеціць пэрспэктывы разьвіцьця торпу.

5-я па ліку рабочая група мае мэту вызначыць энэргетычныя рэсурсы і ў прыватнасьці запасы асноўнага рухавіка беларускай энэргетыкі—торпу.

Існаваньне дзьвёх рабочых груп (з 7-мі організаваных), якія ў аснове сваёй будуць займацца пытаньнямі торпу, лішні раз падкрэсьлівае, якое выключнае значэньне мае проблема торпу, якое выключна вялікае месца будзе займаць торп у будучым агульна-рэспубліканскім гаспадарчым пляне і ў прыватнасьці ў генэральным пляне электрыфікацыі.

Гэта неабходна цьвёрда ўпяміць усім нашым комсамольскім ячэйкам і райкомам, карэнным чынам зьмяніўшы свае адносіны да проблемы торпу.

А хто гэтага ня хоча зразумець, хто ня б'ецца за разьвіцьцё тарпянай прамысловасьці, той злосным чынам саботуе дырэктывы партыі і і комсамолу.

* * *

Торп—энэргетыка!

Вось бальшавіцкая формула.

Беларусь павінна стаць тарпяным Донбасам!

Вось лёзунг сёньняшняга дня.

Комсамол,—на перадавыя пазыцыі!

Вось заклік к неадкладнаму дзеяньню.!

Плянаў асветлі пяцігодак

„Пасьпяховы ход соцыялістычнага будаўніцтва диктуе неабходнасьць прыступіць да распрацоўкі новага, другога пяцігадовага пляну развіцьця народнае гаспадаркі СССР, на аснове высунутай нашай партыяй задачы: „догнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ў тэрмін, ня больш 10 год“. (Куйбышаў).

Генэральны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР, да складаньня якога прыступае ўся краіна, мае адно асноўнае зьвяно. Ухапіўшыся за гэта зьвяно, мы выцягнем увесь ланцуг. Гэта—энэргетыка—электрыфікацыя.

У БССР асноўнай базай разьвіцьця энэргетыкі зьяўляецца торп.

На гэтай базе будуецца увесь плян разьвіцьця энэргетычнай гаспадаркі, суцэльнай электрыфікацыі краіны і разьвіцьця на базе электрыфікацыі ўсяе народнае гаспадаркі БССР.

Адзінства экономікі БССР дазваляе разглядаць яе як адзіны Беларускі Соцыялістычны Энэргопрамысловы Комбінат, асноўнай базаю якога зьяўляецца торп. Комбінат, спэцыялізаваны ў асноўным на тарпяной, лясной і сельска-гаспадарчай прамысловасьці.

Адзіная сыстэма магутных раённых электрычных станцый і цёплаэлектрацэнтраляй, пабудаваных на базе вялікіх, тарпяных масываў Беларусі, комбінаваная з паралельнай сыстэмаю гідростанцый і прамысловых цёплаэлектрацэнтраляй, якія базуюцца на адкідах вытворчасьці, зьвяжа ўсю краіну сыстэмай высокавольтных магутных перадач і пакрые яе суцэльнай сеткаю—электрычнай і цеплавою, укараніць электрычную энэргію і цяплыню ва ўсе вытворчыя і бытавыя процэсы, падыме іх, на гэтай базе, на вышэйшыя ступені разьвіцьця.

Але наш асноўны народна-гаспадарчы рэсурс—торп—зьяўляецца ня толькі энэргетычным рэсурсам, але адначасова і сыравінам. Торп—гэта хэмічная сыравіна, будаўнічы матар'ял, угнаеньне і падсьцілка.

Побач з разгортваньнем энэргетычнай гаспадаркі рэспублікі на базе торпу, будзе разьвівацца яе магутная тарпяная прамысловасьць.

Уявеце сабе

рад буйных прамысловых галін, як торпахэмічная прамысловасьць, торпападсьцілачная, торпабудаўнічая, торпаўгнаеньня, а далей—разьвіцьцё торпакоксавай (паліўная база для будучай беларускай мэталюргіі) і новую галіну—распрацоўку тарпяных масываў для вытворчасьці паперы.

Усе гэтыя галіны тарпяной прамысловасьці зьвязваюць тарпяную базу па лініі вытворчых процэсаў з іншымі галінамі прамысловасьці БССР. Хэмічная, будаўнічых матар'ялаў, мэталюргічная, папяровая, сельская гаспадарка, а праз яе—харчовая, гарбарная і тэкстыльная прамысловасьць будуць цесна зьвязаны і залежаць ад разьвіцьця торпяной прамысловасьці.

Торп зьвяжа ўсю народную гаспадарку краіны ў адзіны комбінат энэргетычнай сыстэмай электраперадач і энэргапрамысловым комбінаваньнем тарпяной прамысловасьці з іншымі галінамі народнае гаспадаркі.

Адпраўны пункт пры складаньні генэральнага пляну—тарпяная база рэспублікі—Усебеларускі Энэргапрамысловы Комбінат, які аб'ядноае ўсю вытворчасьць краіны ў адзін складаны процэс, ліквідуючы розьніцу паміж горадам і вёскай замяніўшы індустрыяльна-аграрным комбінатам, рэканструюючы быт—матар'яльную базу для канчатковай пабудовы соцыялістычнай грамады.

Па тых грубых

намётках, якія мы зараз маем да канца другой пяцігодкі, у 1937 годзе, агульная магутнасьць энэргетычных установак Савецкай Беларусі павінна вырасьці прыкладна з 50 тысяч кілёват з 1931 г. да 500 тысяч кілёват, г. зн. у 10 раз больш чым у 1931 г.

Орыентовачныя намёткі будаўніцтва ўжо вызначаюць тую магутнасьць, якую будзе ўяўляць Савецкая Беларусь к канцу другой пяцігодкі, калі яе абшары пакрыюцца густою сеткаю электрастанцый і электрацэнтраляй, калі запаляцца вялікія агні 2-ой пяцігодкі і генэральнага.

Для ажыцьцяўленьня генэральнага пляну электрыфікацыі і складаньня яго трэба прыцягнуць увагу ўсяе грамадзкасьці, усіх працоўных нашай краіны. Комсамол, шэф электрыфікацыі, павінен будзе ў гэтай рабоце адыграць асабліва вядучую ролю, бо бяз шырокага абгаварэньня і ўдзелу мас у складаньні пляну, бяз самага шырокага прыцягненьня працоўных да яго ажыцьцяўленьня, генэральны плян электрыфікацыі ня дасьць тых посьпехаў, якія ён павінен даць.

Генэральны плян электрыфікацыі—гэта плян вялікай кладкі муроў соцыялізму.

Гляньце на карту

Па прыблізных орыентовачных намётках магутнасьць першай „Белдрэс“ імя тав. Сталіна будзе даведзена да 92 тысяч кілёват, г. зн.—яшчэ з большай хуткасьцю будуць працаваць новыя варштаты, новыя фабрыкі і заводы Віцебску, Бабруйску, Воршы.

Паглядзеце на Менск

Менская электрычная станцыя ня можа здаволіць прамысловасьць, якая хутка расьце і культурныя ўстановы сталіцы Савецкай Беларусі. Тут вырасьце магутная цёплаэлектрацэнтраль, якая дасьць 24 тысячы кілёват электраэнэргіі.

Менская комсамолія павінна сваё шэфства над электрыфікацыяй выразіць у шэфстве над пабудовай гэтай цёплаэлектрацэнтралі, над забясьпечаньнем яе моцнай энэргетычнай базай, над шпаркім разгортваньнем яе будаўніцтва і патрэбнай якасьці.

Гляньце крыху вышэй

Барысаў. Тут на базе Судабольскага тарпянага масыву вырасьце барысаўская электрычная станцыя, якая зможа даць буйнай прамысловасьці Барысава 24 тысячы кілёват электраэнэргіі. 24 тысячы кілёват увальюцца ў правады і пусьцяць у ход новыя заводы, дадуць хутчэйшы тэмп барысаўскай прамысловасьці.

Барысаўскі комсамол разам з усёй рабочай моладзьзю павінен забясьпечыць баявыя тэмпы будаўніцтва Судабольскай ДРЭС, павінен пусьціць у ход тарпяныя заводы з тым каб да часу заканчэньня пабудовы электростанцыі яна была забясьпечана добрымі мэханізаванымі тарпянымі заводамі.



Зьвярнеце ўвагу на Гомель

ГОМЕЛЬ—адзін з буйнейшых вытворчых цэнтраў Савецкай Беларусі. На базе Кобыльянскіх тарпяных масываў вырасьце Гомельская ДРЭС, якая дасьць у канцы 1933 году 72 тысячы кілёват электраэнэргіі.

Вось баявая задача для гомельскага комсамолу: забясьпечыць баявыя тэмпы ў будаўніцтве гэтага гіганта беларускай энэргэтыкі. Будаўніцтва гэтай станцыі павінна будзе закончыцца ў надзвычай кароткі тэрмін. Забясьпечыць своечасовы пуск гіганта, забясьпечыць яго паліўнай базай, падрыхтаваць спажыўцоў да прыёму энэргіі—вось экзамен для гомельскай комсамоліі.



Паглядзеце на карту

Маленькім пунктам адзначаны Прапойск. На гэтым месцы будзе пабудавана Прапойская ДРЭС, якая дасьць 96 тысяч кілёват электраэнэргіі.

Вышэй—Магілёў

Тут упяршыню будзе пабудавана станцыя, якая забясьпечыць электрычнай энэргіяй маладую галіну прамысловасьці—вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў. Тут будзе пабудавана Магілёўская цёплаэлектрацэнтраль, якая дасьць 10 тысяч кілёват электраэнэргіі. Яшчэ вышэй—Магілёўскі ТЭЦ, ён дасьць 12 тысяч кілёват. Далей поўночна-беларуская ДРЭС, якая будзе пабудавана на базе Абольскага балота і дасьць 24 тысячы кілёват электраэнэргіі.

Акрамя гэтага, па розных кутках Савецкай Беларусі вырастуць з нетраў закінутых беларускіх балот, узьнятыя сілаю вялікай волі пролетарыяту пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, гіганты соцыялістычнай энэргетыкі.

Вось тут, на карце

адзначана Бабруйская „ЦЭЦ“ на 12 тысяч кілёват электраэнэргіі, Рагачова-Клінская—на 6 тысяч Гашнікоўская—на 12, Васілевіцкая ДРЭС на 48 тысяч кілёват і Грэска-Слуцкая—на 12 тысяч кілёват электраэнэргіі.

Гэты плян орыентовачны. Гэта толькі перспэктыўны плян. Але на ім ужо адчуваецца грандыёзнасьць задач, што паўстаюць перад усёй грамадзкасьцю пры яго складаньні і ажыцьцяўленьні.

Гэты плян росту ў 10 разоў за 6-7 год патрабуе вялізарнейшага напружаньня усіх сіл краіны, бо ён павінен быць і будзе дася путы, бо комунізм—гэта Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны, бо

„усё тое, што можа даць сьвету плянава-соцыялістычны лад, які апіраецца на найапошнія багатыя магчымасьці электраэнэргетыкі, зможа стаць выраз толькі тут, бо толькі тут у нас існуюць вялікія заваёвы Кастрычніцкай рэволюцыі, таму што толькі тут упершыню ў сьвеце ажыцьцяўлена перамога працоўных і краіна кіруецца пролетарскай дыктатурай. (Кржыжаноўскі)

Справа ўсяго комсамолу

Дзяржпляя прыступіў да складаньня новага пляну электрыфікацыі краіны, пляну вырашэньня проблемы—„дагнаць і перагнаць“.

Новы плян электрыфікацыі—гэта програма пабудовы соцыялізму. Таму ў яго складаньні павінны актыўна ўдзельнічаць шматмільённыя масы працоўных. Творчая ініцыятыва мас павінна быць накіравана на высоўваньне сустрэчнага пляну электрыфікацыі, лепшай умовы для ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Задача комсамолу—шэфа электрыфікацыі—стаць застрэльшчыкам масавага руху на распрацоўцы пляну электрыфікацыі. Комсамольцы электрастанцый павінны даць сустрэчны максімальнага росту сваёй станцыі, выявіць раёны сваіх спажыўцоў, стварыць магчымасьць пераходу станцый на таннае, мясцовае паліва (торп, сланец), правесьці шырокую праверку правільнасьці выкарыстоўваньня трансформатарных установак і маторнага абсталяваньня, дамагацца выраўніваньня сутачнага графіка.

Комсамольцы электрабудаўніцтва павінны прапрацаваць проекты новых станцый, высоўваючы сустрэчныя графікі, дабіваючыся рашучага скарачэньня тэрмінаў будоўлі, зьніжэньня сабекошту. Комсамольцы электрапрамысловасьці павінны распрацаваць і абгаварыць плян будаўніцтва магутных агрэгатаў, выявіць патрэбу ў новым электраабсталяваньні, электратэхнічных апаратаў, электравозаў, электрасельгасмашын і, на аснове гэтага, дабівацца адпаведнай перабудовы і спэцыялізацыі свайго заводу.

Транспартнікі комсамольцы павінны прыняць непасрэдны ўдзел у складаньні плянаў электрыфікацыі шляхоў і высоўваць сустрэчны рахунак павялічэньня пляну электравозабудаўніцтва. Комсамольцы-колгасьнікі свайму раёну павінны даць сустрэчны па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і жывелагадоўлі (электраворыва, электрадойка, электра-інкубацыя і г. д.), па пабудове рацыянальных паветраных рухавікоў.

Уся гэта работа павінна праводзіцца на аснове шырокага соцыялістычнага спаборніцтва і творчай ініцыятывы комсамольскіх мас.

Комсамольскім організацыям неабходна неадкладна ўключыцца ў работу плянавых органаў, вылучыць комсамольцаў ударнікаў і рацыяналізатараў у камісіі садзейнічаньня (пры краі, обласьці, раёне) складаньню пляну электрыфікацыі, устанавіўшы масавы кантроль над ходам работы. Неабходна прыняць актыўны ўдзел у рабоце энэргетычных конфэрэнцый.

Удзел у складаньні новага пляну электрыфікацыі трэба ўвязваць з масавай разгорнутай пропагандай ідэй электрыфікацыі.

На заводзе, фабрыцы, станцыі, у колгасе неабходна стварыць энэргаячэйкі, якія павінны разгарнуць работу па выяўленьні энэргарэсурсаў, змагацца са стратамі электраэнэргіі, пропагандаваць электратэхнічныя веды.

Комсамольскае электрашэфства павінна зараз перабудавацца на пачатках уцягненьня ўсёй масы членаў саюзу ў складаньне генпляну—пляну перамогі соцыялізму.

Герасімаў.

ПРЫМУСІМ СОНЦА СЛУЖЫЦЬ СОЦЫЯЛІЗМУ

Будаўнікі ўдарнай пяцігодкі—плянавікі генэральнага

Вучэцеся ў Менскай комсамоліі і ўдарнікаў „Полымя Рэволюцыі“ вопыту соцыялістычнага плянаваньня

Віцебск, Гомель, Бабруйск і Магілёў!

Прымайце выклік

Менскі Гарком ЛКСМБ уключыўся ў складаньне пляну электрыфікацыі гораду Менску. Большасьць заводаў і фабрык („Бальшавік“, „Комунарка“ і інш.) склала брыгады комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, якія сумесна з ІТР і гаспадарчымі організацыямі займаюцца дэталёвым вывучэньнем усіх магчымасьцяй разгортваньня прадпрыемства на базе электрыфікацыі.

Па горадзе створаны наступныя сэкцыі: прамысловая, якая ахопліваў мэталёвую, гарбарную, швэйную, харчовую, будматар'ялаў, транспортную і тарпяную вытворчасьці;—сельгассэкцыя ахопнівае вучасткі: жывёлагадоўлю, прыгарадную і гародную гаспадарку;—бытавая сэкцыя з галінамі: мясцовы транспорт, апал і сьвятло. Створана спэцыяльная брыгада на Менскай цяплоцэнтралі.

Менская комсамольская організацыя выклікае Віцебскую, Гомельскую, Бабруйскую і Магілеўскую на лепшы ўдзел у складаньні генпляну.

Абавязацельствы ператвараюцца ў жыцьцё

Зараз, праз два тыдні пасьля таго, як комсамолія Менскага вагона-рамонтнага заводу „Полымя рэволюцыі“ ўключылася ў складаньне генэральнага пляну электрыфікацыі, мы маем магчымасьць падвесьці першыя вынікі барацьбы за электрыфікацыю на нашым заводзе.

Раней было так: электраэнэргіяй карысталіся бяз усякага вучоту, нават дырэкцыя заводу ня ведала колькі энэргіі патрэбна для працы. А зараз комсамольцы дабіліся ўстаноўкі кантрольных счотчыкаў па цэхах, дзе працуе брыгада электраманцёраў на чале з комсамольцам Масэ.

Гэта дае магчымасьць ведаць колькі электраэнэргіі ідзе на асьвятленьне і працу матораў.

Для пераводу паасобных галін працы на электраэнэргію, комсамолія зрабіла наступнае:

Пляцформа, якая саматужным спосабам служыла для нагрузкі і разгрузкі лесаматар'ялаў, зараз ужо электрыфікуецца. Гэта дасьць экономію 15 тыс. руб. штогод.

Гарнавы награў заклёпак па ўсім табарным цэху пераведзен на электранагрэў. Гэтае мерапрыемства экономіць час, рабсілу і вугаль і дае каля 30 тысяч рублёў экономіі.

Комсамольскі колектыў узяў шэфства над электразваркай заводу і паставіў сваёй мэтай перавесьці на электразварку ўсе процэсы змацаваньня вагонаў. Электразварка будзе акомсамолена.

Праводзіцца ўлік нагрузкі матораў, на не нагружаныя ўключаюцца новыя трансмісіі (дрэваапрацоўчы цэх).

Комсамольская брыгада зьвязалася з комсамольцамі саўгасу „Ржаны“ і пачала працу па складаньню пляну электрыфікацыі саўгасаў.

Такім чынам, у бліжэйшы час мы здолеем прадставіць плян электрыфікацыі нашага заводу.

Адзін з галоўных недахопаў ўсёй працы—гэта тое, што ў работу ўцягнуты ня ўвесь комсамольскі колектыў. Аднак, гэтую памылку мы выправім на хаду і па-бальшавіцку выканаем свае абавязацельствы.

Ул. С.

Варашылаўцы ўключыліся

Плянава-опэрацыйная група інструмантальнага цэху заводу імя Варашылава прыняла выклік плянавікоў заводу „Полымя рэволюцыі“ па распрацоўцы матар'ялу генэральнага пляну электрыфікацыі БССР і, у прыватнасьці, нашага заводу.

У зьвязку з гэтым, група абавязалася ў бліжэйшы час агледзець агульныя прывадныя трансмісіі, якія прыводзяць некальвкі варштатаў, маркуючы для экономіі энэргіі перавесьці іх на асобныя трансмісіі.

Вывучаем электрозварку і магчымасьць прыстасаваць яе па заводзе.

Улічваючы, што проблема торпу ў генэральным пляне электрыфікацыі займае асобае месца, мы абавязаліся сачыць за сваячасовым выпускам торпмашын.

Мы лічым, што плянава-опэрацыйныя групы, разам з адміністрацыйна-тэхнічным пэрсоналам, павінны зараз-жа пачаць складаць пляны электрыфікацыі нашага заводу.

Эфэктыўнасьць усіх гэтых мерапрыемстваў павінна быць вызначана ў лічбах.

Мы выклікаем усе плянава-опэрацыйныя групы нашага заводу прыняць актыўны ўдзел у складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі БССР.

По даручэньні плянава-опэрацыйнай групы інструмантальнага цэху І. Гельфанд.

МТС наперадзе

Заслаўе. У Заслаўскім раёне сярод рабочых і служачых шырока разгарнулася падпіска на пазыку „3-га рашаючага году пяцігодкі“. 25 рабочых Заслаўскай МТС падпісаліся на 800 руб. Райтэхнік Заліўскі падпісаўся на 170 руб.

Прыбытак

Буйному об'екту генпляну—ударныя тэмпы

Ужо канчаткова вырашана пытаньне аб пабудове Менскай цяплоэлектрацэнтралі, нават і проект зацьверджаны. Аднак, да пабудовы яшчэ ня прыступлена і падрыхтоўка ня вядзецца.

ЦЭЦ зьяўляецца ўдарнай пабудовай і буйным об'ектам генпляну электрыфікацыі. Аднак, да гэтага часу канчаткова ня вырашана хто будзе будаваць: Электрацэнтр, ці Белбудаб'яднаньне.

Два працаўнікі пабудовы ЦЭЦ загружаны не сваёй працай і ня маюць магчымасьці форсаваць пачатае будаўніцтва.

Неабходна прыняць усе захады, каб пабудову ЦЭЦ пачаць зараз-жа. Гэта—справа ўсёй Менскай комсамоліі. У першую чаргу гэтым павінны зацікавіцца комсамольскія організацыі ВСНГБ, Белдзяр буду і Энэргацэнтру.

Брыгада Гаркому на ЦЭЦ Барбараш.



Комунараўцы чакаюць

Плянава-опэрацыйныя групы заводу „Комунар“ яшчэ не адказалі на выклік плянавікоў заводу „Полымя рэволюцыі“.

На нашы запытаньні аб праробленым, сэкратар колектыву ЛКСМБ адказаў: — Адно паседжаньне сарвалася, мяркуецца склікаюць аб'яднанае бюро колектываў усіх мэталюргічных заводаў.

Мы чакаем ад плянава-опэрацыйных груп і ўсяго колектыву ЛКСМБ заводу „Комунар“ конкрэтнага адказу практычнымі справамі.

Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ

ВУЧЭЦЕСЯ У ЛЕПШЫХ З ЛЕПШЫХ

Брыгады Шчалкунова, Казэрды і Маслава перавыконваюць заданьне па торпаздабычы.

Па іх павінны раўняцца ўсе рабочыя торпазаводаў

Дабіцца карэннага пералому

Тарпавы завод „Шлях да соцыялізму“ (Добруш, Гомельскага раёну) адстае ў выкананьні прамфіпляну.

Да апошняга часу грамадзкасьць заводу ня была мобілізавана на ліквідацыю прарыву. І толькі зараз, калі выязное бюро ГБ ЛКСМБ распусьціла бюро ячэйкі і перавыбрала тарпком заводу, праца палепшылася.

Мобілізаваныя комсамольцы пачынаюць дапамагаць у разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Комсамольцы заводу „Рухавік рэволюцыі“ ня выканалі заказу на дастаўку частак к торпамашынам, а калі комсамольская ячэйка торпзаводу зьвярнулася да іх з адкрытым лістом, дык не стрымала слова.

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Герой працы“, якая знаходзіцца ў адлегласьці 5 кілёмэтраў і карыстаецца торпам гэтага заводу, не знайшоў часу ўзяць над ім шэфства.

Культвыхаваўчае працы на заводзе няма. Замест фізкультуры паануюць карты.

Гарком комсамолу павінен сыстэматычна кіраваць працай ячэйкі заводу і аказваць ёй штодзённую дапамогу.

Тураўскі і Гузоўскі.

Выклік лепшым

Гомель, 26, (Белта). Брыгада Шчалкунова на торпазаводзе „Давыдаўка“, уступіўшы ў соцспаборніцтва з лепшымі брыгадамі торпазаводу Гомельшчыны—Казэрды (Шлях да соцыялізму) і тав. Маслова (Давыдаўка)—паказала яшчэ вышэйшую продукцыйнасьць працы. Калі брыгада Казэрды выпрацавала за зьмену 51400 цэглін, а брыгада Маслава 52,200 цэглін, дык Шчалкуноў даў 53,400 цэглін за зьмену.

ЯШЧЭ ВЫШЭЙ ЗДАБЫЧЫ ТЭМП!



23-е чэрвеня дало значнае пераўзыходжаньне здабычы торпу ў параўнаньні з учарашнім. Усяго здабыта за гэты дзень 3381,8 тон торпу, што складае—41,2 проц. сутачнага заданьня. Такім чынам, пляну не выканапы на 12,4 проц. Да гэтага дня здабыта—870,68,1 тон торпу, што складае 31,1 проц. каляндарнага пляну.

8-мі МАЛАДЫХ НЭГРАЎ ЧАКАЕ ЛЁС САКО І ВАНЦЭЦІ

МАСАВЫЯ ДЭМОНСТРАЦЫІ ПРОТЭСТУ Ў АБАРОНУ АХВЯР СУДОВАЙ ПРОВОКАЦЫІ

Расправа з удзельнікамі рэволюцыйнай работы

Яшчэ мільённыя масы рабочых і працоўнага сялянства не забыліся пра жудасную кару на электрычным крэсьле па провокацыйнаму прыгавору амэрыканскага суда т. т. Сако і Ванцэці, Муні і Бэлінгса, як амэрыканскі фашысцкі суд Лінча вынес новы прысуд сьмерці 8-мі маладым нэграм, провокацыйна абвінавацішы іх у замаху на згвалчаньне белых жанчын.

Гэты чарговы тэрорыстычны акт буржуазнай юстыцыі сустрэнуты магутнай хваляй абурэньняў і протэстаў шырокіх працоўных мас. Выканком МОПР'у зьвярнуўся з адозвай да працоўных усяго сьвету:

— „Усе, як адзін уздымайцеся на протэст! Масавымі магутнымі дэмонстрацыямі выступайце на абарону ахвяр судовай провокацыі капіталістых“.

Комсамольскія організацыі разам з Мопрам павінны стаць на чале масавай кампаніі протэстаў супроць чарговага тэрорыстычнага выпаду амэрыканскага фашызму—кары сьмерцю на электрычным крэсьле 8-мі маладых нэграў.

Патрабуем асвабаненьня асуджаных

Рэволюцыйны ўздым рабочае клясы ў краінах капіталу бязупынна ўзрастае, ня гледзячы на зьверскія расправы фашыстых з лепшымі байцамі за справу пролетарыяту.

Агульны сход Менскага вузла МББ чыг. з абурэньнем протэстуе супроць зьверскага провокацыйнага прысуду над васьмі нэгрыцянскімі рабочымі і патрабуе іх асвабаненьня.

У адказ на ўзмацненьне фашысцкага тэрору, мы ўсе ўступаем у рады МОПР'у.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Камсамол Менску-шэф рэалізацыі пазыкі ў вёсцы

28-га чэрвеня 1931 г. а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы імя К. Маркса адбудзецца сход актыву Менскай арганізацыі ЛКСМБ па пытаньню ўдзелу Менскай арганізацыі КСМ у ліквідацыі прарыву па выкананьні фінпляну і ходу рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага году 5-цігодкі“.

Прапануецца ўсім калектывам і ячэйкам ЛКСМБ сёньня-ж атрымаць білеты ў Гаркоме ЛКСМБ.—

Сакратар Менгаркому ЛКСМБ Янковіч.—

Юнкоры-ўдарнікі, не запамятайце!

27-га чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ (Карла Маркса, 38) адбудзецца нарада юнкораў-ударнікаў па пытаньню організацыі скразнога рэйду праверкі падрыхтаванасьці да новага навучальнага году,

На нараду павінны зьявіцца юнкоры заводу „Варашылава“, „Бальшавік“, „Комунар“, Полымя рэволюцыі“, фабрыкі „Кастрычнік“ і юнкоры Пэдтэхнікуму і Хэміка-Тэхнолёгічнага тэхнікуму.

Оргмасавы сэктар газэты „Чырвоная Зьмена“

Друкарня імя тав. Сталіна.
Галоўлітбел № 599